# ПОБЫТ çЖАНОЧАГА ДЗЯЦІНСТВАè У ТРАДЫЦЫЙНАЙ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ ВЁСЦЫ
# EVERYDAY LIFE OF çWOMEN’S CHILDHOODè IN THE TRADITIONAL VILLAGE OF WESTERN POLESIE

Гугнюк Аксана Аляксандраўна,
Брэст, Беларусь

Ключавыя словы: дзяцінства, вясковыя дзяўчаты, традыцыйны побыт, працоўныя абавязкі, матэрыяльная культура, вольны час.

Рэзюмэ. У артыкуле разглядаецца побыт вясковых дзяўчат на этапе дзяцінства. Надаецца ўвага пытанню перыядызацыі дзяцінства. Аналізуецца сямейнае становішча дачкі ў сям’і, яе асноўныя абавязкі. Расказваецца аб рэчавым свеце дзяўчатак, спецыфіцы баўлення імі вольнага часу ва ўмовах традыцыйнага ладу жыцця.

Keywords: childhood, village girls, traditional life, work responsibilities, material culture, leisure time.

Summary. The article examines the traditional life of village girls at the stage of childhood. It tells about the periodization of childhood. The article analyzes the marital status of the daughter, her work responsibilities. It tells about the material world of girls, their leisure time.

Комплекснае вывучэнне гісторыі штодзённасці (мужчынскай / жаночай) патрабуе ў тым ліку паасобнага разгляду ўсіх узроставых этапаў жыцця чалавека: дзяцінства, юнацтва, сталасці. Праблематызацыя дзяцінства спалучае ў сабе шэраг пытанняў: узаемадачыненні дзіцяці ў сям'і і па-за яе межамі, спецыфіка яго выхавання, сацыялізацыі, асаблівасці побыту, фарміраванне ідэнтычнасці. Гісторыка-этналагічны разгляд кожнага з пытанняў дазволіць больш дакладна ўявіць сацыякультурную карціну мінулага канкрэтнага этнакультурнага асяроддзя. Як зазначыла расійскі гісторык штодзённасці Г. В. Бялова: çДзяцінства – паняцце, гістарычна, культурна і этнічна абумоўленаеѐ [1]. Засяродзімся на вывучэнні паўсядзённага побыту дзяўчынак з традыцыйнай заходнепалескай вёскі.

Сярод айчынных даследчыкаў няма адзінага меркавання з нагоды дакладнага вызначэння межаў дзяцінства. А. Дз. Якубінская, вывучаючы спецыфіку сацыялізацыі дзяцей, вылучае два перыяды дзяцінства: першы – (узрост ад нараджэння да 6–8 гадоў) і другі – (узрост ад 6–8 гадоў да 12–14 гадоў) [2, с. 3]. У. А. Лобач перыяд ад 6–8 гадоў да 14 гадоў адносіць да падлеткавага [3]. Л. В. Ракава прапаноўвае разглядаць ўзроставыя перыяды наступным чынам: маленства – ад нараджэння да 6–8 гадоў; дзяцінства – ад 6–8 да 12–14 гадоў; падлеткавы ўзрост – ад 12–14 да 16–17 і юнацтва – ад 16–17 да 18–20 гадоў [4, с. 66]. Сыходзячы з матэрыялаў інтэрв'ю, у вясковым асяроддзі існавала ўласная ўмоўная перыядызацыя дзяцінства, якая ўвасаблялася праз найменні : çдзіцяѐ (ад нараджэння да 6–8 гадоў), "дзіўчынка" (ад 6–8 гадоў да 14–16 гадоў), çдзівкаѐ (ад 14–16 год да ўступлення ў шлюб). Зразумела, для кожнага з узроставых этапаў прадугледжваліся асобныя метады і накірункі выхавання, накладваліся розныя абавязкі і быў характэрны спецыфічны рэчавы свет.

Матэрыяльна-побытавае асяроддзе, у якім знаходзіліся дзеці, шмат у чым вызначала спецыфіку іх сацыяльнай і культурнай адаптацыі. Розныя элементы матэрыяльнай культуры мелі непасрэдную сувязь з полам і ўзростам іх носьбітаў і выконвалі функцыі іх сацыялізацыі [5, с. 4]. Пры умовах, калі çжылі з поляѐ (елі і апраналіся), авалодванне працоўнымі навыкамі як мага раней было выключна важным. З самых ранніх гадоў дзяўчынак прывучалі да выканання жаночай працы. Па словах рэспандэнтаў, гэта адбывалася ўжо з 5–6 (у некаторых выпадках з 4) гадоў. Асноўнымі ролямі, якімі надзялялі дзяўчынак, былі нянька і пастух. Таму перыяд з 6 да 13 гадоў айчынныя даследчыкі называюць çпастуховымѐ ці "пастухоўствам" (Г. П Арлова, С. П. Жлоба). Дзеці вельмі часта былі прадастаўлены самі сабе, альбо заставаліся пад наглядам не на больш старэйшых дзяцей ці бабуль, што, нярэдка, было прычынай рознага роду пашкоджанняў (сабака, паршук знявечыць, у сажалку зойдзе дзіця, натрапіць на ежу хатніх жывел). Сыходзячы ў поле, маці пакідала малодшых дзяцей з старэйшай дачкой:

*«Малых оставлялы на нас. Я сама старша була. Колысь брат Сцёпа плача-плача, а маты няма, а я ёму цыцку даю. А якая ў мяне тая цыцка. Я вжэ трапочку намочу, в сахар обмокну яе і дам емуȅ* [6].

Даволі спецыфічнай з’явай было падлеткавае адыходніцтва. Здаралася, што дзяўчынкі, па прычыне адсутнасці зямлі ў бацькоў, наймаліся на працу да іншых гаспадароў. Дзяцей з бедных або шматдзетных сем’яў аддавалі “ў наймы”. Найчасцей, дзяўчаткі займаліся выпасам жывёлы. Жылі яны ў гаспадароў, за іх кошт. Аплата мела ў асноўным натуральны характар. Рэспандэнка распавядала аб сваім асабістым вопыце наступнае:

*«Я была сірота і скотэну пасла по сусідніх дэрэвнях, была пастухом. Жыла в хозяіна. Він мэні пуд жэта за ціло літо за корову платэв. Я 7–9 штук пасла і получала 7–8 пудовȅ* [7].

Пастушкам даводзілася і ў непагадзь пасвіць скот. Басанож дзеці пераганялі жывёлу праз вадаёмы, што прыводзіла да псавання ільняных спадніц (ў падножжы размочваліся ніткі). Такія ўмовы дзіцячай працы прыводзілі да частых захворванняў, ў тым ліку рэпрадуктыўнай сістэмы.

Пры ўмове, калі зямлі ў сямейнай гаспадарцы было шмат, дзеці дапамагалі ў зямельных работах ўжо непасрэдна сваім бацькам і не шукалі сабе працы па-за хатай. Адна з рэспандэнтак распявядала:

*«У нас було зымлі много, то мы в наймы до богачів нэ ходэлэ. В сэбэ робэлэȅ* [8].

Асноўнай працай, якую выконвалі дзяўчынкі – агарод, прыбіранне хаты, дапамога ў хатняй гаспадарцы: дойка кароў, кармленне і выпас хатняй жывёлы. Нярэдка, праца, якой надзялялі дзяўчынак, была не супастаўнай з іх фізічнымі магчымасцямі і аказвала згубнае ўздзеянне на здароўе, аб чым сведчаць матэрыялы інтэрв’ю:

*«Чуть подрастёшь і ўсё. Я дітэй няньчыла, і трэба було хату прыбрать, зілля нарвать. Тож хозяйство трымалы. Карову закрыць, свіней пакарміць. Ны здужаю тое відро, суну, суну….по зэмлі сунэш тое відро, шоб тэм свіням влытэ как-тоȅ* [9].

Дзеці не саромеліся выконваць любую працу. Нялёгкасць жыцця, бедната, спачуванне бацькам спараджалі жаданне дапамагчы ім. Не з прынукі працавалі, а таму што разумелі неабходнасць.

Умовы і патрэбы вясковага жыцця, сезоннасць сельскагаспадарчай працы, ў якой значную дапамогу аказвалі дзеці, не разглядалі адукацыю ў якасці жыццёва неабходнай задачы. Дзеці разглядалася бацькамі з пункту гледжання іх карысці у хатняй гаспадарцы, з прычыны чаго яны зрэдку наведвалі школу. Значны ўплыў аказвалі складанасці з матэрыяльным забеспячэннем дзіцяці базавымі матэрыяльнымі рэчамі (абутак, адзенне), недабраўпарадкаванасць дарог, далёкая адлегласць школ ад хат, прыярытэт працы над адукацыяй стрымлівалі жаданне бацькоў аддаваць дзяцей у школы. “Траціць дарэмна час на навуку не патрэбна, хай лепей прадзе і вучыцца пры матцы быць добраю гаспадыняю” – звычайная развага сялян [10, с. 47]. Рэспандэнты, успамінаючы сваё дзяцінства, падкрэслівалі, што вучыцца ім хацелася, але незаўсёды была такая магчымасць. Дзяцей прыводзілі да разумення важнасці іх дапамогі ў хаце, наглядзе за малодшымі братамі і сёстрамі.

Дзеці з ранніх гадоў разглядаліся бацькамі як каштоўныя памочнікі ў працы, таму праводзіць час у гульнях не заўсёды ўяўлялася магчымым. *“Не было калі*

*граты. Мы былі заняты: свіні трэба було пасці, коз, вэчкі"* [11]. Але, было, што дзятва наладжвала гульню і падчас пасьбы.

Рэдка святкавалі дзецям дні нараджэння, бо работы было шмат, дый "не было чым" [12]. Звычайна сяляне дакладна не ведалі дату нараджэння і рабілі прывязку да царкоўнага свята [13]:

*"Мні маты дні рожденні ны робэлэ. А колэ ты родэлася? Ой ны пом'ятаю, мусыть до Трійцы було трі нэділі?, пусля Трійцы другоі нэділі. А я знаю колэ і в якому году, Бог знае…".*

Радаснай падзеяй для малых, як і ва ўсе часы, было свята – магчымасць адпачыць, лепей апрануцца, а самае галоўнае – смачна паесці.

*"Колы свято, дытэй прыбірають, вадуть у цэркву. Радосць дітям була капуста, сыр в маслі. А як пірога напэкуть пуд Роздво чы на Пасху, то дітям на радосць. Бо пэріг тылько був на Паху і Роздво"* [7].

Святы і ў выходныя дні былі часам, калі дзяўчынкі маглі адпачыць у коле сяброў. Традыцыйнай формай баўлення часу дзяўчатак былі гульні. Асартымент цацак у сялянскіх дзяцей у XIX – першай палове XX ст. вялікай разнастайнасцю не адрозніваўся. Большасць з іх былі самаробнымі і іх выгляд залежаў ад фантазіі аўтара і наяўнасці падручных матэрыялаў [14, с. 45]. Рэспандэнты адзначаюць, што па прычыне абмежаваных эканамічных магчымасцяў, бацькі не маглі дазволіць купіць дачцэ лялькУ. Па гэтай прычыне, лялькі антрапаморфнага выгляду вырабляліся самастойна альбо дзецьмі, альбо бацькамі.

Матэрыял для вырабу лялек быў разнастайным. Іх выраблялі, у тым ліку, з нітак, саломы, пладоў раслін. З гузікаў рабілі вочы.

*"Лялькі робылі з онуч старэх, з лоток. Вузьмамо накрутымо латку, тай голова, а пусля бэрэм лозынку – тай рукы робымо. А очы - то горошок ныколы рус, звалэ вовчі горох. Прыліпімо дэ як: намылімо, каб нэ впав –тай очы"* [15]. *"Труну зробім з досок. Гэтае дзіця заміcь помрэ, то голосім, прыплакваем по тых дзецях, то крыжа зробім. Закопаем"* [16].

Лялька для дзяцей ўяўлялася адушаўлёнай. Яе надзялялі імём, будавалі "хату", стваралі камфортныя ўмовы для "жыцця". "У гульні з лялькай дзяўчынкі перш за ўсё выконвалі ролю маці, якая калыша, корміць, размаўляе з дзіцем, ходзіць на працу і ў царкву" [17, с. 213]. Нават прымітыўная лялька ўсё ж была вялікай радасцю для сельскіх дзяўчынак, і нярэдка перадавалася паміж сёстрамі. За адсутнасцю шырокага асартыменту цацак, у дзяцей складалася трапяткое стаўленне да таго, што было. Як зазначыў А.Д. Гарбач: "З лялькаю дзяўчынка робіць як-бы рэпэтыцыю ўсяго таго, што ей прыйдзецца рабіць з сваімі дзяцьмі, калі яна будзе маткаю: вучыцца трымаць лялькУ на руках, спавівае яе, прыкладае ссаць да грудзі, калыша яе ў калысцы ці ў начовачках, пяе ей калыханкі, цалуе і б'е яе" [10, с. 47].

У гульнях дзеці рэпрадуцыравалі свет дарослых. Гульня з лялькай уяўляла сабой імітацыю адносін "дачка-маці". Так, маленькая дзяўчынка асвойвала сваю жаночую ролю. "Дзяўчынкі з дзяцінства знаходзіліся побач з маці іаднаўлялі спачатку ў гульні, а потым і практыцы ўсе працоўныя абавязкі, якія патрабавалася выконваць жанчыне дома ў полі" [18, с. 192]. Маленькія дзеці знаходзілі цікавым для сябе ўсё, што іх атачала:

*"Прынэсуць пэску, бабкэ ліплять в хатэ. Тож пудлогі ны було. Колобка робэлэ з полотна, туды соломэ напхають. А як батькэ шлы у поле, то з собою малэх*

*забіралэ. Сідять вжэ, то траву, то цвіточкэ рвуть по полю, бігають, віночка плэтуть. І забавляюцца гэтым"* [7].

"*А як діты малыі – хто што у матэры украдэмо – вэсілля робымо (смяецца), той украв сала, я смэтаны вкрала, гурків занэсла, вжэ вэсілля в нас, вжэ мы йімо, дэ вжэ в кого ранні еблыка – нарвэм да на рэку нэсэмса, вжэ знов вэсілля в нас (смяецца). Да граемо, да музыка*" [19, с. 14].

Дзяўчаткі таксама любілі гуляць ў "вяселле" і "радзіны". Для гэтых "урачыстасцяў" яны пяклі пірагі з гразі на сонцы [10].

Такім чынам, эканамічнае становішча, уласцівае традыцыйнай заходнепалескай вёсцы, уплывала на сямейныя дачыненні, у тым ліку на становішча дачкі ў сям'і. З дзяцінства дзяўчатак навучалі базавым гаспадарчым навыкам. З ранніх гадоў яны апасродкавана прымяралі на сябе сацыяльныя ролі гаспадыні (праз прыцягненне да працы) і маці (прыглядаючы за малодшымі дзецьмі). Латэнтным механізмам канструявання гендэра выступала гульня, пад час якой дзяўчаткі рэпрадуцыравалі свет дарослых. Нягледзячы на тое, што пачатковую, чатырохгадовую адукацыю атрымала нямалая колькасць вясковых дзяцей, школа не з'яўлялася галоўнай крыніцай ведаў для дзяцей. Вучыліся яны больш на ўласным вопыце і ад старэйшых. Цэнтральнымі інстытутамі выхавання заставаліся сям'я, царква, грамада.

Літаратура


1. Белова, А. В. «Мир женского детства» в дворянской России XVIII – середины XIX века как методологическая проблема истории повседневности [Электронны рэсурс] / А. В. Белова. Рэжым доступу: https://cyberleninka.ru/article/n/mir-zhenskogo-detstva-v-dvoryanskoy-rossii-xviii-serediny-xix-veka-kak-metodologicheskaya-problema-istorii-povsednevnosti/viewer. – Дата доступу: 11.05.2021.
2. Якубінская, А. Д. Традыцыйныя спосабы і сродкі сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX ст.: аўтарэф. ... дыс. канд. гіст. навук 07.00.07 / А. Д. Якубінская; Бел. дзярж. ун-т. – Мінск, 2009. – 22 с.
3. Лобач, У. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры [Электронны рэсурс] / У. Лобач. Рэжымдоступу: http://elib.psu.by:8080/bitstream/123456789/903/1/SMS_06_Lobac.pdf. – Дата доступу: 11.05.2021.
4. Ракава, Л. В. Полаўзроставыя ступені дзяцінства / Л. В. Ракава // Адукацыя і выхаванне. – 2006. – № 2. – С. 65–69.
5. Токарев, С. А. К методике этнографического изучения материальной культуры / С. А. Токарев // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://journal.iea.ras.ru/archive/1970s/1970/1970_4_Tokarev.pdf/. – Дата доступа: 20.03.2020.
6. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Лук'яновіч С. А. – в. Бездеж, Драгічынскі р-н, 2016.
7. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Дземідзюк В. М. – в. Барысава, Кобрынскі р-н, 2018.
8. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Лукашук Л. С. – в. Паляцічы, Кобрынскі р-н, 2018.

9. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Жук І. Г. – агр. Дзівін, Кобрынскі р-н, 2017.

10. Гарбач, А. Д. Рысы старога быту ў жыцьці беларускіх сялянак у вёсках Шалавічы і Новыя Наборкі Бабруйскай акругі і вёсках Дразды і Малішава Мазырскай акругі / А. Д. Гарбач // Наш край. –1929. – № 3. –С. 46–52.

11. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Кісялевіч Я. Ф. – в. Раджалавічы, Ганцавіцкі р-н, 2016.

12. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Крысько І. І. – в. Верашкі, Івацэвіцкі р-н, 2016.

13. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Красько Н. С. – в. Рагозна, Брэсцкі р-н, 2019.

14. Мішына, В. І. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў : гісторыка-культуралагічны аспект: вучэб.-метад. комплекс для студ. спец. 1-21 03 01 "Гісторыя" / склад. і агульная рэд. В. І. Мішынай. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 220 с.

15. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Данілковіч Я. С. – в. Здітава, Бярозаўскі р-н, 2019.

16. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Мінько В. Г. – в. Хатынічы, Ганцавіцкі р-н, 2016.

17. Ракава, Л. В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XX – XXI стст. / Л. В. Ракава. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 311 с.

18. Орлова, А. П. Этнопедагогика: учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по педагогическим специальностям / А. П. Орлова. – Минск : РИВШ, 2014. – 408 с.

19. Навагродскі, Т. А. Народная кухня тышкаўцоў / Т. А. Навагродскі, І. У. Алюніна, С. А. Захаркевіч. – Мінск : [б. в.], 2010. – 195 с.